# Лукашэнка нам патрэбны.

Рэдакцыя газеты “ВЫБАР”
22 кастрычніка 1996 г.

**Уладзімір Плешчанка – Мікола Плавінскі**

**Ул.П.** – Напярэдадні ўсёткі рэспубліка ўзбуджана была. Такое ўраджаньне, нават у нашым ціхім Віцебску: людзі многія ўжо спадзяваліся, думалі, што Кангрэс нешта вырашыць. Прыехалі ў Менск – і не адбылося нічога. Выйшаў на вуліцы ў асноўным БНФ-аўскі электарат. Гэтыя людзі ўжо выходзілі. Зьбіралася і болей. Відаць, добра спрацавала, я лічу, тая фальшыўка, якую пусьцілі слугі Лукашэнкі. Гэта рапарт нейкага Шкуна палкоўніка. Можа там нешта і было ў гэтым. Былі сабраныя войскі з усёй Беларусі.

Як Лукашэнка паўсюдна робіць? Дэмагогія, дэмагогія – а потым хлусьня праходзіць. Ня ўсё ж можна хлусіць адразу. Тады, калі хлусіш, гэтая хлусьня адразу бачна. А калі дэмагогію пусьціць, а потым яўную хлусьню недзе там прапусьціць – яна і праходзіць.

Лічу, Захаранка памыліўся. Мог зачытаць на Кангрэсе гэтую фальшыўку, але павінен быў сказаць пры гэтым: “Людзі, яны нас палохаюць”. А зроблена было, нібыта гэта сапраўды трагедыя. Нават з Кангрэсу людзі многія паехалі дадому. Ад’язжалі тыя, хто звычайныя абываценлі, якія можа і выйшлі бы, але тут перапужаліся.

Што адбылося? Тое, што Лукашэнка на 7-е не прызначыў рэферэндум, а на 24-е… А я хацеў бы, каб ён на 7-е прызначыў. Ты ведаеш, Лукашэнка ўсёроўна пойдзе на парушэньне закону. Парламент саступае яму. Ён зробіць тое, што хоча. Але ён зробіць сваё, практычна заручыўшыся падтрымкай парламенту, або ягонай маўклівай згодай. Вось ён іх суе ў бруд…, а яны паддаюцца і ня ўстане супрацьпаставіць сябе. Яго трэба выштурхнуць, ён лезе на парушэньне прававога поля, лезе нахабна, дык трэба дапамагчы яму выскачыць зь яго. А сёньня Вярхоўны Савет, упіраючыся і саступаючы яму, яму дае карт-бланш, а сам практычна ідзе на парушэньне прававога поля.

Сёньня ўжо ёсьць два праекты Канстытуцыі. Як адзін ня можа прымацца на рэферэндуме Лукашэнкі, так і праект Вярхоўнага Савета таксама. Яны ж ня маюць права новую Канстытуцыю ўносіць, а гэта ж практычна новая Канстытуцыя. Трэба было ўперціся, і сказаць адразу: “Праект Канстытуцыі твой – не зьмяненьні, а звычайны новы праект. На рэферэндуме ён не прымаецца. Значыць мы адмаўляем гэтае пытаньне ставіць на рэферэндум”. Яму б няма куды было падзецца. Альбо адмовіцца, альбо праводзіць рэферендум пры парушэньні Канстытуцыі.

А што ў Менску? Менск сапраўды быў увесь ачэплены. За 1,5 км да Палацу Спорту ўсё было заблакавана. Некалькі ланцугоў стаяла міліцыянтаў. Вядома, саме лепшае было б, каб людзі туды ўвогуле не ішлі, аніводзін чалавек. Але ж народ такі… ён вытрымаць ня можа, яму трэба паглядзець на дзіва. Як людзі не заклікалі на мітынгу туды не хадзіць, але ж Статкевіч узяў ды прапанаваў: “Я пайду глядзець ім у твар, у вочы”. І ўсе пабеглі за ім. Каму там было глядзець у вочы? Вельмі добра было б, каб яны там стаялі, а перад імі нікога не было!

Праўда, зьнешне міліцыянты паводзілі сабе прыстойна. Газы з вадамётамі яны не выкарыстоўвалі. Ну, яно сапраўды і не патрэбна было. Каб зварушыць неяк людзей, можна было б запатрабаваць ад Вярхоўнага Савета імпічменту, ці яшчэ што. А так на мітынгу прапановы і былі аб прыняцьці заклíку аб імпічменту. Але рэальна, трэба глядзець праўдзе ў вочы, большасьць насельніцтва хоча, каб Лукашэнка кіраваў. А як можна аб’яўляць імпічмент, нават калі ў Вярхоўным Савеце будзе большасьць за гэта, калі большасьць народа супраць. Народ ня хоча паважаць законнасьць. Народ сам ня хоча паважаць Канстытуцыю. Прэзідэнт парушае Канстытуцыю, а ён адабрае гэтыя парушэньні. Ну, ня звыкся народ жыць у прававой дзяржаве. Значыць, нам яшчэ патрэбны

гэты звычайны папуліст, авантурыст, які перамяжоўвае авантурныя прамовы з хлусьнёй і дэмагогіяй.

**М.П.** – У гэтага так званага “народа” і прадстаўнік іменна такі, у якога рабская сьвядомасьць, у якога ня выйшла яшчэ боязь масавая. Прытым, ніхто іх і не вучыў ніколі (свабодзе).

**Ул.П.** – Самае дзіўнае вось, глядзі, што. Там, на мітынгу, выступалі дэпутаты. У асноўным выступалі лідары апазіцыі. А на мітынгу былі людзі, у якіх пазіцыя такая, што іх прадстаўнікоў у Вярхоўным Савеце няма – фронтаўскі электарат. На мітынгу выступалі дэпутаты, якія атрымалі ад карт-бланш ад народа, які сам нічога рабіць ня будзе, а спадзяецца, што гэтыя дэпутаты самі ўсё змогуць зрабіць. Выступалі тыя, якія мандаты надбалі, казалі людзям прыемнае, тое, што ад іх хацелі чуць. А цяпер тыя людзі ня ў стане іх падтрымаць.

Вось бяда Беларусі ў чым: дэпутаты сёньня імкнуцца нешта рабіць сапраўды, але калі ішлі на выбары, яны ж карысталіся падтрымкай людзей, якія іх саміх цяпер ні чым не падтрымліваюць. Тыя людзі хацелі аднаго – абы ціха было. Яны не хацелі нацыянальную ідэю ўспрымаць, бо гэта цяжка, трэба нешта вывучаць.

**М.П.** – Ім патрэбная кілбаса.

**Ул.П.** – Так. Яны казалі: “Мы бяз мовы, з Расіяй сябраваць будзем”. Пабудуем эканоміку. Рынкавыя рэформы пойдуць. Усё нармальна будзе. Ну, і людзі падтрымалі іх. Падтрымалі Шушкевіча, Багданкевіча. А электарат іхні на мітынгі не ідзе, дэпутатаў сваіх не падтрымлівае. А ідзуць людзі, у якіх дэпутатаў няма. Якія адкрыта ішлі і казалі: “Без нацыянальнай ідэі не пабудуем дзяржаву. Калі яе ня будзе, ніякая эканоміка не падымецца”. Іх ня так многа сёньня. Але былі прадстаўнікі з усёй Беларусі – літаральна ледзь ня з кожнага горада раённага.

**М.П.** – Усебеларускі сход.

**Ул.П.** – Можа і так, сапраўды сход. Глядіш плакацік – Слонім, Жодзіна, Барысаў, Хоцімск (дзе той Хоцімск?). З Ліды прыязжалі, з Горадні, Браслава, з Паставаў, з Навалукамля.

Але ж дзіўна тое, што менчукі ня выйшлі самі. Вось гэты прэзідэнт па іхніх вуліцах езьдзіць. У іх няма дэпутатаў – прадстаўнікоў іхняга горада. 10 тыс. Менчукоў павінны былі замяніць аднога дэпутата. А ў іх 40 дэпутатаў няма. І трэба было 400 тыс. Чалавекам выйсьці, каб нешта вырашыць. А яны маўчаць у горадзе сваім. Гэта такі ж люмпен, як у нас у Віцебску. Проста больш інтэлігенцыі, больш разумных людзей, студэнтаў.

Запалохалі людзей. Калі чалавека можна запалохаць, значыць яны яшчэ не падрыхтаваныя. У сьвядомасьці падтрымаць гатовы, а да дзеяньняў не даходзіць. Таму, відаць, Лукашэнка нам патрэбны.

**М.П.** – Яшчэ не наеліся. Ён іхні ж прадстаўнік.

Памятаеце, як ён увайшоў у кроў і плоць? Бо ён іхні ж прадстаўнік, гэтай плоці і крыві. Гэтая маса, якую ён падтрымлівае – яна як раз і жывіцца ад іх. Яны могуць згаджацца быццам бы з лагічнымі довадамі, можа і хочуць яму нешта запярэчыць. Але яны – ягоны электарат. Гэта страшна.

Ня гледзячы на тое, што яшчэ пры сталінізме я бачыў такое ж, на столькі гэта выхавана. Трэба цярпець пакуль, бо раней нічога ня зробіш. Гэта можна пераадолець толькі цераз нейкую ўжо кроў вялікую, якая навошта? А вось так, мірным шляхам пакуль не выходзіць.

Але кожнаму чалавеку абрыдзе калі-небудзь выпрацоўваць вось гэта. Абрыдзе. І гэта ў масах.

Расчараваньня няма. Ёсьць нармальная палітычная барацьба маладога здаровага электарату той часткі сумленных людзей, якія ведаюць свае мэты і ў якой ён не згвалціў розум.

Чым ён бярэ? Насы яшчэ ня ўсе данасілі, даелі. У беларусаў даўно стаіць такая мэта – абы не было вайны. Няма чаго зьдзіўляцца. Мы стаім на скрыжаваньні дарог. Заўсёды стаялі. Вы чыталі "Невядомая вайна" Сагановіча? Там праз 10-20 гадоў паўтаралася такая ж гісторыя – выбівалася ўсё. Адтуль ідзе няпэўнасьць: "дай я лепш пачакаю". Але, пакуль так думае – і жыцьцё сканчаецца.

Тут можа спрацаваць, напэўна, толькі нецікавасьць. Як у 1991 годзе. Магчыма, гэта залежыць ад той жа Расіі.

Там жа, пульхір палітычны, як кажуць, лопне. Бо няма цэментуючай сілы. Гэтым быў цар – як Іван Жахлівы, як Пётр Аляксеевіч. Такія цары, якія любой крывёй вялікай замацоўвалі яднаньне. Зараз у іх такога такога цара няма. Ёсьць цар Барыс ІІ. Але ён… там зараз, па-руску кажучы, "броженіе". Кожнаму хочацца ўзьлезьці. А фігуры асобнай няма. Калі прапаноўвалі прэзідэнцкія кандыдатуры, я не знайшоў аніводнай Асобы. У такой вялікай краіне. Там проста барацьба за ўладу.

Ёсьць Напалеон, Пётр І, Іван Грозны – гэта былі фігуры. Пры ўладзе. Яны, як бы там не было, ведалі як яе ўтрымаць адпаведна сваім магчымасьцям. А цяпер такой фігуры няма. Можа, яшчэ высунецца.

Дык вось, мы залежым ад іх. Раптам там – трысь, брысь, бах… – а мы залежныя ад іх. Ад Захаду тут нічога не залежыць зараз. Польша нас стабільнее. А Ўсходу ў якасьці калоніі мы не патрэбныя. Мы ім патрэбны больш за тое. Яны рабавалі, рабуюць і будуць рабаваць нас.

А між іншым, мы багатыя. Калі можна рабаваць. Гэта праезд, у зямлі амаль усё яшчэ тырчыць: і алмазы, і золата, і іншыя меньш каштоўныя мэталі. Газаправоды. Усё тут.

І мужчынкі, якія ваяваць нядрэнна могуць. Калі-небудзь можна і дамовіцца, і выкарыстаць тактыку якой-небудзь Чачні.

**Ул.П.** – Ваяваць могуць, але ж не за сябе.

**М.П.** – Нічога, нічога. Для іх гэта цікава. А ў якасьці калоніі – не, бо тады як раз і спрацуе той фактар, як у Чачні. Калі моладзі, хоць пэўнай часткі, захочацца абараняць сябе. Са зброяй у руках. Вось тады пачнецца, ня дай бог, канечна, лепш палітычным спосабам – у мазгах перамены. Прыйдзецца вырашыць – ці, ці – бо самому можна тады будзе ўпасьці на полі брані.

А пакуль дзейнічаюць тыя, у каго сьветлыя галовы. Але такіх мала. Як бы там не было, а нядаўнія адраджэнцыя дзейнічаюць так, як ім гэта дазваляе ўлада. А зараз яны пахаваліся, як клапы.

**Ул.П.** – Так, так (сьмяецца).

**М.П.** – І адтуль глядзяць, калі ім ізноў дазволяць. Вось і ўсё. І іх вінаваціць няма за што. Яны не падрыхтаваныя. Іх няма.

**Ул.П.** – Дык вось, дзядзька Мікола, мы прывыклі бачыць, што лідары больш за нас. А мы былі на гэтым мітынгу і адчувалася, што лідараў няма. Больш-меньш моцных.

Вось у расейцаў Пётр І або Іван Грозны – калі цар нашмат узвышаецца над сваім асяродкам, тады ён вядзе. Калі няма лідара, звычайна ёсьць група лідараў. Былі мы на гэтым мітынгу і, як ня крыўдна прызнаць, лідара тут на Беларусі зараз няма. Ён, відаць

быў, але ж яго паспрабавалі ня толькі Лукашэнка, але і сябры ў тым ліку, паспрабавалі яго нейкім чынам адсуль адправіць.

А калі няма лідара, павінна быць група лідараў. Лідар крыху вышэй за астатніх, ён перашкаджае астатнім, замінае ім стварыць групу лідараў. Мы паглядзелі на мітынгу – і групы такой лідараў няма. Калі б яны былі лідарамі, яны павялі б так працу і ў Вярхоўным Савеце, і сярод грамадзтва, што Лукашэнка ўжо даўно б вылез за прававое поле. Гэтага пакуль няма.

Вылезшы за прававое поле, яму можна было б прад’явіць любыя прэтэнзіі, яго можна было б зьняважыць міжнароднай супольнасьцю. Нават, тая Расія ад яго адмовілася б даўно, калі б ён за прававое поле выскачыў. А так, мы неяк супраціўляемся, крычым, крычым… У Маскву езьдзяць. А ён там патрэбны. Яны ж Украінай гэтай горкай навучаны. Хоць Шарэцкі і кажа, што мы будзем з вамі сябраваць, а яны баяцца. Ня дай бог, Шарэцкі пачне сваю палітыку самастойную праводзіць.

А Лукашэнка надзейны. Яны лепш яго будуць стрымліваць: “Саша, спыніся”. Але ж, казаць будуць, прытрымліваць будуць, а Саша ведае, што ніхто ня скажа яму: “Вон!” ці “Сядь на место!”.

**М.П. –** Валодзя,  а ўсёткі для лідараў сёньня цяжка.

(працяг будзе)